эты.

**В. Мачульскі.**

## Да выданьня бібліографіі беларускага пэрыодычнага друку

**„Летапіс беларускага друку“, ч. IV.** Пэрыодычны друк на беларускай мове. *Менск, 1927 г.*

Ня буду шмат гаварыць аб тым, якая прыемная зьява—гэтая першая спроба выданьня бібліографіі пэрыодычнага друку на беларускай мове. Бязумоўна, яе трэба толькі вітаць. У гэтым аглядзе мы маем каштоўны даведачнік для кожнага дасьледцы беларускай культуры.

На тытульнай старонцы выданьня адзначана: „выданьне корэктурнае“. Тое-ж самае пацьвярджаецца і ў прадмове: „Беларуская Дзяржаўная Бібліотэка разглядае гэту працу, як

выданьне корэктурнае, якое ў далейшым можа быць дапоўнена і выпраўлена, асабліва пры дапамозе ўсіх зацікаўленых справай беларускага друку". Кіруючыся такімі адносінамі выдаўцоў да гэтай працы і далучаючы сябе да „зацікаўленых справай беларускага друку", хачу ў гэтай заметцы прапанаваць некаторыя дадаткі і папраўкі. Падставаю для іх зьяўляюцца матэрыялы, якія ёсьць у Беларускім Аддзеле . Славянскага Аддзяленьня Бібліотэкі Акадэміі Навук.

Дадаткі мне прыдзецца зрабіць няэначныя. Для зручнасьці буду прытрымлівацца парадку разьдзелаў і тых парадкавых нумароў унутры, якія прыняты ў разгляданым выданьні.